# [Мінсувязі выпускае ў абарачэнне канверт з арыгінальнай маркай «30-годдзе стварэння Садружнасці Незалежных Дзяржаў»]

14 верасня 2021 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне канверт з арыгінальнай маркай «30-годдзе стварэння Садружнасці Незалежных Дзяржаў». Дызайн С.Цырулік. Праект падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Выканаўчым камітэтам Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

*Пагадненне аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў і Алма-Ацінская дэкларацыя падпісаны ў снежні 1991 года.*

*За 30 гадоў свайго развіцця Садружнасць стала ўніверсальнай рэгіянальнай міждзяржаўнай арганізацыяй, якая не мае аналагаў.*

*Садружнасць садзейнічала вырашэнню самых складаных праблем, якія ўзніклі пасля распаду СССР, спрыяла развіццю паміж дзяржавамі-ўдзельніцамі раўнапраўнага палітычнага дыялогу, пабудовы на новай аснове механізму гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння, гуманітарнага партнёрства, супрацоўніцтва ў сферы забеспячэння бяспекі.*

Спецыяльнае памятнае гашэнне будзе праводзіцца 27 верасня на паштамце Мінска.

https://www.belpost.by/philately/infolists/3340

**Source URL:** *https://www.mpt.gov.by/news/14-09-2021-7470*